# ПРАВАЕ ЦІ ЛЕВАЕ? ДУЭТ

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

Потым вучні ўяўляюць працэс лічэння — перасоўваюць костачкі візуальна ў адпаведнасці з матэматычнымі дзеяннямі. Рукі пры гэтым таксама працуюць, але на ўяўных сарабанах. Паступова хуткасць лічэння ўзрастае, а колькасць прыкладаў павялічваецца. Калі пераходзяць да двухзначных лічбаў, лічаць абедзвюма рукамі. Такім чынам адначасова развіваюцца і слыхавыя, і зрокавыя, і тактыльныя якасці.



Ілля адначасова расказвае верш на беларускай мове і лічыць.

На занятках вучні паводзяць сябе вольна, пахвілінна ўскокваюць, бо, як усе дзеці, не могуць спакойна сядзець на месцы, адказваюць наперабой, свабодна размаўляюць з трэнерам і ўцягваюць яго ў гульню. Здаецца, пануе звычайная дзіцячая мітусня. Але, як толькі на экране пачынаюць міргаць лічбы, дзеці імгненна ўключаюцца ў працэс. Аказваецца, гэта нават правіла паводзінаў для вучняў. Кіраўнік школы «Сарабан» і трэнер Алена Санько ўпэўнена: «Толькі свабоднае па прыродзе дзіця можа ўспрыняць інфармацыю».

Гульня. Менавіта ў такім фармаце праходзяць урокі. Размінка для пальчыкаў, «знайдзі памылку», «даміно», практыкаванні ў спецыяльных падручніках, і нават лічэнне на сарабане, які знаходзіцца на падлозе, з дапамогай ног. Не дзіва, што паўтары гадзіны пралятаюць непрыкметна, а навучанне не здаецца цяжкім.

— Ужо шосты раз прыходжу ў «Сарабан». Усё лёгка пакуль даецца, і пры гэтым цікава на занятках, — кажа васьмігадовая Маша.

На першы погляд здаецца ўсё проста, але любое заданне патрабуе ад дзіцяці вялікай канцэнтрацыі. У адных атрымліваецца адразу, іншым патрабуецца месяц і больш, але рана ці позна навука даецца ўсім. Нават за тыя паўтары гадзіны, што я прысутнічала на занятках, назірала і слёзы, калі нешта крышачку не атрымлівалася, і неверагодную радасць, калі адказ аказаўся правільным.

Раз у тыдзень вучні наведваюць школу і кожны дзень займаюцца па 10-15 хвілін дома самастойна на спецыяльных анлайн-трэнажорах.

— Анлайн-трэнажор распрацаваны такім чынам, што, пакуль не зробіш папярэдняе заданне, нельга перайсці да наступнага, — расказвае Алена Санько. — Гэта дысцыплінуе. Акрамя таго, вучні бачаць наколькі паспяхова з практыкаваннем справіліся іншыя. Складаецца пэўны рэйтынг, што стымулюе больш старацца. Для дзяцей 4-11 гадоў (а менавіта да гэтага ўзросту мозг развіваецца найбольш актыўна, і ніводнае з паўшар'яў пакуль не дамінуе) такая рэгулярная нагрузка не здаецца вялікай, але патрабуе пэўнай адказнасці і руплівасці.

На самай справе навучыцца лічыць — гэта не канчатковая мэта, а толькі спосаб трэніроўкі мозга. Усё роўна як спартсмен развівае сваё цела штодзённымі заняткамі, так і дзіцячы мозг можна натрэніраваць. Усяго за два гады рэгулярных практыкаванняў здольнасці хутка канцэнтравацца і «працаваць галавой» даводзяцца да аўтаматызму, ад чаго ў мозгу ўтвараюцца нейронныя сувязі. Чым іх больш, тым вышэй узровень развіцця чалавека. Актыўная праца мозга становіцца звыклай (пераходзіць на падсвядомы ўзровень), а значыць, не патрабуе ад дзіцяці вялікага напружання. Уявіце сабе, чаго яно можа дасягнуць, калі пры ўсім яшчэ прыкладзе намаганні?



Нават пяцігадовыя маляняты спраўляюцца з сарабанамі.

Сапраўды, падчас заняткаў вучні набываюць навыкі, якія будуць карыснымі пры любых разумовых працэсах у далейшым жыцці. У дзяцей паляпшаецца памяць, павышаецца канцэнтрацыя, уважлівасць, развіваецца ўяўленне, здольнасць хутка рэагаваць, успрымаць вялікую колькасць інфармацыі і вылучаць з яе найбольш важную. У звычайнай школе вучням «Сарабана» значна лягчэй даюцца прадметы.

**У адных атрымліваецца адразу, іншым патрабуецца месяц і больш, але рана ці позна навука даецца ўсім.**

— Пра ментальную арыфметыку чула ўжо даўно, — кажа маці дзесяцігадовай Маргарыты. — Сёння ўсё хутка развіваецца, вялікая колькасць інфармацыі, трэба паспяваць яе засвойваць, умець карыстацца. У самой часам праблемы з гэтым, хачу, каб у дачкі іх не было. Наведваем «Сарабан» ужо крыху больш за месяц. Узнікаюць, вядома, пэўныя цяжкасці, але вельмі цікава, і дачка займаецца з задавальненнем.

За добрымі вынікамі стаіць штодзённая праца. Нават летам вучні школы «Сарабан» працягваюць займацца. Калі не могуць наведваць заняткі, працуюць з дапамогай анлайн-трэнажораў. Затое ў верасні, калі пачнуцца школьныя заняткі, дзеці з лёгкасцю ўключацца ў працэс навучання, бо ўсё лета трымалі свой мозг «у тонусе».

**У дзяцей паляпшаецца памяць, павышаецца канцэнтрацыя, уважлівасць, развіваецца ўяўленне, здольнасць хутка рэагаваць, успрымаць вялікую колькасць інфармацыі і вылучаць з яе найбольш важную. У звычайнай школе вучням «Сарабана» значна лягчэй даюцца прадметы.**

— Яшчэ адна вялікая перавага праграмы «Сарабан», — кажа Алена Санько, — у тым, што дзеці, становяцца больш упэўненымі ў сабе. Калі бачаць, што ў іх атрымліваецца, за спіной вырастаюць крылы. Павышаецца самаацэнка. А з упэўненага дзіцяці вырасце ўпэўнены ў сабе дарослы чалавек.

**Яна ЛЫЧКОЎСКАЯ,**
**Фота аўтара.**



Дзеці лічаць з дапамогай ног.



■ Нататкі таткі

## САПРАЎДНАЯ ПАМАГАТАЯ

**Перад майскімі святамі мы ўсёй сям'ёй ездзілі ў вёску да бабы Дуні дапамагаць садзіць бульбу. Безумоўна гэты занятак не мог прайсці без удзелу Васілісы. З кошыкам амаль у палову свайго росту яна важна прагульвалася па полі і апусціла некалькі клубняў у нарэзаныя пад каня градкі. І, нягледзячы на тое, што астатні час яна прабавіла на лузе з дзьмухаўцамі, усе, да вялікай радасці малой, называлі яе памагатай. Вечарам, калі ўжо былі дома, дачка важна рэзюмавала: «Дапамагла садзіць бульбу бабе Дуні, а бабе Нюшы — не. Трэба ж дапамагчы»... Такія думкі двухгадовай дзяўчынкі мяне вельмі парадавалі.**

Змалку мы былі прывучаны да працы. Той, хто вырас у вёсцы, ведае, што, каб нешта мець на стале, трэба зрадніцца з мазалямі на руках. Вось і ў нас, апроч кароў, свіней і курэй, былі яшчэ і немалыя надзелы зямлі. Усё гэта патрабавала шмат часу і працы. Паколькі бацькі з усім проста фізічна справіцца не маглі, частка клопатаў была на нашых плячах. Кожны з дзяцей ведаў свае абавязкі і сумленна іх выконваў. І часу, дарэчы, хапала і на тое, каб паспяхова вучыцца ў школе, і на гульні з сябрамі. Але размова не пра гэта. Мяне не перастае здзіўляць, як умела тата і мама прывучалі нас да працы. Не было ніякага прымусу. Усё ішло само сабой.

Памятаю, як са старэйшай сястрой збіралі крываўнік для малых індыкоў. Справа такая марудная, а індыкі такія пражэрлівыя... Каб крыху падсаладзіць «корманарыхтоўку», маці дазваляла нам паралельна ладзіць невялічкія пікнікі. І вось мы, як і дарослыя, бралі ссабойку і накіроўваліся на поле побач з домам. Такі падыход даваў нам унутранае пачуццё важнасці нашай працы. Потым, калі крыху падраслі, нас пачалі з сабой браць на хутар да дзеда, дзе засаджваліся шматлікія грады. Пакуль старэйшыя займаліся справай, каб заняць нас, маці кожнаму выдзяляла невялічкі кавалак зямлі, на якім можна было садзіць, што душа пажадае. Умова была адна: даглядаць надзел будзем самастойна. Ішоў час, і з узростам шырылася кола абавязкаў, да якіх мы былі ўжо падрыхтаваныя, бо не раз назіралі, як гэта робяць бацькі. Пры гэтым важна адзначыць, што дарослыя ніколі не абмяжоўвалі нас у эксперыментах. Нават калі працоўныя спробы завяршаліся не вельмі ўдала, не было жорсткіх пакаранняў. Так, маглі пажурыць, за рэдкім выпадкам «даць крапівы». У большасці ж сваёй проста даводзілася разбірацца з наступствамі той ці іншай шкоды.

Калі Васіліса навучылася цвёрдым крокам вымяраць кватэру, мы пачалі па магчымасці дазваляць ёй прымаць удзел у нашых хатніх справах. Напрыклад, мые матуля падлогу — малая абавязкова хоць хвілінку дапаможа. Выльe што-небудзь на стол — даём ёй сурвэтку, каб сама магла выцерці. Абіраем бульбу, яна падае яе з вядра. Дарэчы, гатаваць дачка любіць больш за ўсё. Ужо добрай традыцыяй у нас стала на выхадныя ляпіць разам варэнікі. Раніцай Васіліса ледзь толькі паспявае расплюшчыць вочы, хутчэй будзіць нас: «Я прачнулася. Будзем рабіць варэнікі». І ў гэтай справе яна не проста назіральніца: прымае ўдзел у вымешванні цеста, каштуе яго на смак, як можа, узбівае вяршкі для запраўкі. Яна абавязкова папросіць, каб далі магчымасць зазірнуць у каструлю, дзе кіпіць вада. Сваю страву яна потым есць куды з большым апетытам.

Зразумела, што ў кожнай справе вытрымкі Васілісы не хапае на доўгі час, але мы ўсё адно заахвочваем яе намаганні дапамагаць і не дазваляем ленавацца. На днях яна раскідала па пакоі свае цацкі і стала прасіцца, каб ёй пачыталі. Дамовіліся, што спачатку яна пазбірае сваіх лялек. Ахвотна прыступіла да справы. Праз хвіліну са словамі: «Тата, давай разам» прыбегла за мной. Пачалі наводзіць парадак. Гляджу, дачка адышла ўбок і назірае. Пытаюся: «У чым справа?» — «Тата, ты пазбірай, а я тут пастаю. Я ж хітрая, так?» — выдала Васіліса. Давялося тлумачыць, што хітрыкам у працы месца няма, а справу заўсёды неабходна даводзіць да канца. «Табе ж не спадабаецца, калі я не дачытаю казку?» — гэты аргумент стаў канчатковым, і дачка зноў прынялася за працу.

Крыху вышэй я адзначыў, што не перастаю здзіўляцца таму, як бацькі прывілі нам працавітасць. Гэта пачуццё ў мяне з'явілася толькі з нараджэннем дачкі. Менавіта Васіліса дапамагла мне зразумець, колькі вытрымкі на гэта неабходна. У паўсядзённым жыцці мы так абмежаваны ў часе! Звычайна хочацца хуценька павырашаць усе хатнія клопаты, каб адпачыць пасля працы, а не расцягваць гэтыя справы на гадзіны ад таго, што пад рукамі будзе «блытацца» малое. І менавіта гэтая спакуса так часта перашкаджае нам у выхаванні дзяцей. Паддаўшыся ёй, мы рызыкуем не толькі вырасціць гультая, але і страчваем сваё права стаць настаўнікам і аўтарытэтам для таго, кім даражым больш за ўсё.

**Аляксандр АЛЕСІК.**